*УДК 070:001.92(476)(091)*

# НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНАЯ ЖУРНАЛІСТЫКА Ў БЕЛАРУСІ: ГІСТАРЫЧНЫ АСПЕКТ

***Г. К. ТЫЧКО***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Абгрунтоўваецца неабходнасць даследавання гісторыі станаўлення навукова-папулярнай журналістыкі ў Беларусі. Разглядаюцца вытокі навукова-папулярнай плыні ў польскамоўнай прэсе Беларусі XIX ст. На падставе аналізу рэдактарска-выдавецкай дзейнасці І. Лялевеля і А. Г. Кіркора вызначаюцца праблематыка і жанрава-тэматычная накіраванасць публікацый навукова-папулярнага характару. Робяцца высновы аб узаемаўплыве і ўзаемазалежнасці сацыяльна-грамадскіх каштоўнасных і эстэтычных дамінант і функцыянальна-эстэтычных параметраў прэсы.

***Ключавыя словы:*** навукова-папулярная журналістыка; навуковы часопіс; чытацкая аўдыторыя; аўтарскі актыў; асветніцкія традыцыі; жанравая палітра; тэматычная разнастайнасць; функцыянальнае прызначэнне.

# НАУЧНО-ПОПУЛЯРНАЯ ЖУРНАЛИСТИКА В БЕЛАРУСИ: ИСТОРИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

***Г. К. ТЫЧКО***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Обосновывается необходимость исследования истории становления научно-популярной журналистики в Беларуси. Рассматриваются истоки научно-популярного течения в польскоязычной прессе Беларуси XIX в. На основе анализа редакционно-издательской деятельности И. Лелевеля и А. Г. Киркора определяются проблематика и жанрово-тематическая направленность публикаций научно-популярного характера. Делаются выводы о взаимовлиянии и взаимообусловленности социально-общественных и ценностно-эстетических доминант и функционально-эстетических параметров прессы.

***Ключевые слова:*** научно-популярная журналистика; научный журнал; читательская аудитория; авторский актив; образовательные традиции; жанровая палитра; тематическое разнообразие; функциональное назначение.

# SCIENTIFIC POPULAR JOURNALISM IN BELARUS: HISTORICAL ASPECT

***H. K. TYCHKO***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The necessity of researching the history of the formation of national scientific popular journalism is substantiated. The origins of the scientific popular direction of the Polish-language press in Belarus in the 19th century are considered. Based on the analysis of the editorial and publishing activities of I. Lelevel and A. G. Kirkor, the problematic and genre-thematic

**Образец цитирования:**
Тычко ГК. Навукова-папулярная журналістыка ў Беларусі: гістарычны аспект. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика.* 2023;1:56–61.
https://doi.org/10.33581/2788-6638-2023-1-56-61

**For citation:**
Tychko HK. Scientific popular journalism in Belarus: historical aspect. *Journal of the Belarusian State University. Journalism.* 2023;1:56–61. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2788-6638-2023-1-56-61

**Автор:**
***Галина Казимировна Тычко*** – доктор филологических наук, профессор; профессор кафедры периодической печати и веб-журналистики факультета журналистики.

**Author:**
***Halina K. Tychko***, doctor of science (philology), full professor; professor at the department of periodical press and web journalism, faculty of journalism.
*tychko@mail.ru*
*http://orcid.org/0000-0002-9379-924X*

orientation of publications of a scientific and popular character is determined. Conclusions are made about the mutual influence and interdependence of socio-public value and aesthetic dominants and functional and aesthetic parameters of the press.

***Keywords:*** scientific popular journalism; scientific magazine; readership; author's assets; educational traditions; genre palette; thematic diversity; functional purpose.

## Уводзіны

Навукова-папулярная журналістыка – асаблівая сфера сродкаў масавай інфармацыі, у якой разглядаюцца, аналізуюцца і інтэрпрэтуюцца актуальныя для грамадства праблемы навуковага плана. У публічнай трактоўцы навукова-папулярная журналістыка ўспрымаецца як своеасаблівы пераказ спецыялізаванай навуковай інфармацыі на больш простай, даступнай для шырокай аўдыторыі мове. Пад навуковым часопісам разумеецца выданне, што папулярызуе не толькі навуковыя веды, але і вучоных – спецыялістаў у той ці іншай галіне. Як у сусветнай, так і ў беларускай інфармацыйнай прасторы навукова-папулярная журналістыка мае даўнія і трывалыя традыцыі.

Так, у дарэвалюцыйнай расійскай гістарычнай перыёдыцы вылучаліся гісторыка-літаратурныя (папулярныя і навукова-папулярныя) часопісы і навуковыя, вузкаспецыялізаваныя выданні [1, с. 28]. У XIX ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі распаўсюджваліся расійскія гісторыка-літаратурныя навукова-папулярныя часопісы П. У. Барценева «Русский архив» (Масква, 1863–1917), М. І. Сямеўскага «Русская старина» (Санкт-Пецярбург, 1870–1918), С. М. Шубінскага «Исторический вестник» (Санкт-Пецярбург, 1880–1917) і інш. Гэтыя выданні былі разлічаны на шырокую рускамоўную чытацкую аўдыторыю, вызначаліся высокім прафесійным узроўнем і займалі вядучае становішча ў рускай дарэвалюцыйнай навукова-папулярнай журналістыцы. Навукова-папулярныя часопісы, арыентаваныя на масавую аўдыторыю, адрозніваліся ад вузкаспецыялізаваных выданняў тым, што галоўнае месца ў іх займалі матэрыялы, прысвечаныя праблемам як айчыннай, так і сусветнай гісторыі, культуры і пытанням гісторыі айчыннай літаратуры [1, с. 34–35].

Разам з тым значную ролю ў інфармацыйнай прасторы тагачаснай Беларусі адыгрывалі польскамоўныя навукова-папулярныя выданні, найперш тыя з іх, што так ці інакш былі звязаны з культурным асяроддзем Вільні, якая з'яўлялася інтэлектуальным і навуковым цэнтрам сацыяльна-грамадскіх і творчых эліт беларускіх зямель. Згаданы аспект зараджэння і функцыянавання спецыялізаванай прэсы, а таксама яе роля ў жыцці тагачаснага беларускага грамадства пакуль мала даследаваліся, у сувязі з чым яны патрабуюць актуалізацыі. Гэта асабліва важна ва ўмовах глабалізацыі, якая правакуе ўніфікацыю культурнага ландшафту і становіцца выклікам традыцыйнай культуры праз стварэнне пагрозы ўзнікнення культурнага разрыву паміж прадстаўнікамі розных пакаленняў.

## Асноўная частка

Навукова-папулярная плынь польскамоўнай прэсы, разлічанай на беларускую аўдыторыю, зарадзілася ў XIX ст., калі ў 1815 г. польска-беларускі гісторык, прафесар Віленскага ўніверсітэта і Варшаўскага ўніверсітэта Іаахім Лялевель (1786–1861) пачаў выдаваць у Вільні навукова-літаратурны часопіс «Віленскі штотыднёвік» («Tygodnik Wileński»). У першыя гады існавання гэта выданне выходзіла штотыдзень, але ў 1818 г. яго перыядычнасць змянілася (нумары публікаваліся 1 раз у 2 тыдні). Першым рэдактарам часопіса быў І. Лялевель, потым яго ўзначальвалі М. Балінскі, І. Шыдлоўскі і М. Альшэўскі. З 1817 г. часопіс «Віленскі штотыднёвік» меў цесныя сувязі з асветніцкім легальным літаратурна-грамадскім аб'яднаннем ліберальнай інтэлігенцыі «Таварыства шубраўцаў» («Towarzystwo szubrawców»)[1], якое дзейнічала ў Вільні ў 1816–1822 гг. Напачатку гэта аб'яднанне існавала ў выглядзе ініцыятыўнай групы асветнікаў, якія, аналізуючы сутнасць навуковага пазнання, крытыкавалі як аматарства ў навуцы, так і празмерны даследчыцкі педантызм. Шубраўцы, у абавязак якіх уваходзілі сістэматычная творчая праца (кожныя 20 дзён даць матэрыял для публікацыі), рэгулярнае чытанне як мінімум адной палітычнай і літаратурнай газеты, папаўненне ўласнага кнігазбору, мелі друкаванае выданне «Вулічныя навіны» («Wiadomości brukowe»). Нягледзячы на гэта, многія сябры таварыства публікаваліся на старонках часопіса І. Лялевеля. Таксама ў выданні «Віленскі штотыднёвік» з вершам «Гарадская зіма» («Zima miejska») у 1818 г. дэбютаваў А. Міцкевіч. Тут размяшчалі свае арыгінальныя і перакладныя творы Ю. Каржанеўскі, А. Э. Адынец, К. Сянкевіч, Л. Бароўскі, А. Гарэцкі, Р. Корсак, Т. Нарбут, Ф. Булгарын, В. Сянкоўскі і інш. Шмат увагі

[1]Шубраўцы // Энцыкл. гіст. Беларусі : у 6 т. Т. 6. Кн. 2: Усвея – Яшын. Дадатак / пад рэд. Г. П. Пашкова і інш. Мінск : БелЭн, 2003. С. 232.

надавалася фалькларна-этнаграфічным матэрыялам. Часопіс спыніў сваю дзейнасць у 1822 г. Трэба адзначыць, што большасць аўтараў выдання, як і І. Лялевель, былі выкладчыкамі Віленскага ўніверсітэта, у якім на той час дзейнічалі таемныя студэнцкія патрыятычныя арганізацыі (філаматы, філарэты, прамяністыя). У 1823 г. па справе аб прыналежнасці да гэтых арганізацый былі арыштаваны дзясяткі выхаванцаў навучальнай установы, у тым ліку А. Міцкевіч, 108 чалавек былі аддадзены пад суд, а пазней 20 найбольш актыўных удзельнікаў былі высланы ў розныя гарады Расійскай імперыі. У сувязі з гэтым пастановай ад 14 жніўня 1824 г. былі звольнены з пасад і высланы з Вільні І. Лялевель, І. Даніловіч, Л. Бароўскі і інш.

У маі 1832 г. з-за прамога ці ўскоснага ўдзелу студэнтаў і выкладчыкаў у паўстанні 1831 г. Віленскі ўніверсітэт быў зачынены. Аднак традыцыі, закладзеныя І. Лялевелем і яго аднадумцамі, працягвалі жыць. Праз некалькі дзесяцігоддзяў справу па станаўленні навукова-папулярнай журналістыкі ў Польшчы, Расіі, Літве і Беларусі працягнуў знакаміты гісторык, этнограф, археолаг, публіцыст і выдавец Адам Ганоры Кіркор (1818–1886).

Пасля сканчэння Віленскай гімназіі ў 1838 г. А. Г. Кіркор служыў у Віленскай казённай палаце. У 1849 г. ён стаў членам Віленскага статыстычнага камітэта, а ў 1850–1854 гг. рэдагаваў афіцыйнае ўрадавае выданне «Памятные книжки Виленской губернии», што змяшчала звесткі статыстычнага характару, артыкулы па мясцовай гісторыі, эканоміцы, этнаграфіі і інш. З 1855 г. А. Г. Кіркор з'яўляўся кіраўніком Віленскага музея старажытнасцей, якому пазней ахвяраваў свае калекцыі, і членам Віленскай археалагічнай камісіі – навукова-асветнай установы, створанай па ініцыятыве Я. Тышкевіча, якая існавала з 1855 па 1865 г. і займалася зборам і даследаваннем помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры на тэрыторыі Беларусі і Літвы. У яе склад уваходзілі Юзаф Крашэўскі, Уладзіслаў Сыракомля (Л. Кандратовіч), Канстанцін Тышкевіч, Адам Плятэр, Тэадор Нарбут, Мікалай Маліноўскі, Міхаіл Балінскі, Мікалай Акелайціс, Вацлаў Пшыбыльскі і іншыя вядомыя прадстаўнікі тагачасных літаратурных і навуковых колаў рэгіёна. Камісія падтрымлівала сувязі з іншымі падобнымі ўстановамі Еўропы[2]. У 1856 г. А. Г. Кіркор стаў членам-карэспандэнтам Імператарскага археалагічнага таварыства, а ў 1857 г. – членам Рускага геаграфічнага таварыства.

Аднак А. Г. Кіркор займаўся не толькі навуковай працай, яго цікавілі літаратурная і выдавецкая дзейнасць і журналістыка. Першай спробай на гэтай ніве стаў выдадзены ім у 1843 г. у Вільні навукова-літаратурны альманах «Радэгаст» («Radegast»), названы ў гонар заходнеславянскага бога. У 1845–1846 гг. А. Г. Кіркор публікаваў альманах «Разумовыя дзённікі» («Pamiętnik umysłowy»), у якім размясціў свае працы па гісторыі, этнаграфіі, археалогіі Беларусі і Літвы. З 1857 па 1858 г. ён выдаваў неперыядычны зборнік «Віленскі партфель» («Teka Wileńska»), у 1-м і 2-м нумарах якога быў надрукаваны вялікі гісторыка-краязнаўчы нарыс Уладзіслава Сыракомлі «Мінск» [2–3]. У публікацыі расказвалася аб прыродзе і архітэктуры горада, апісваліся вуліцы, знакавыя будынкі, крамы віленскіх кнігавыдаўцоў Ю. Завадскага, М. Аргельбранда і І. Рафаловіча, прыводзіліся цікавыя статыстычныя звесткі, падавалася гісторыя горада ад старажытнасці да 1793 г., калі Мінск быў уключаны ў склад Расійскай імперыі. Акрамя таго, Уладзіслаў Сыракомля, расказваючы пра вераванні і звычаі крывічоў, згадваў славуты помнік усходнеславянскай літаратуры «Слова пра паход Ігаравы» і сцвярджаў, што легендарны Баян нібыта жыў у Мінску 800 год таму. У нарысе прыводзіліся звесткі пра наведванне горада Пятром І і Карлам XII, заснаванне першай друкарні ў 1635 г. і адкрыццё рэгулярнай пошты ў 1717 г.

На жаль, было выдадзена толькі шэсць нумароў зборніка «Віленскі партфель», у якіх асвятлялася культурнае і навуковае жыццё краю, публікаваліся матэрыялы даследаванняў членаў Віленскай археалагічнай камісіі. У 1858 г. выданне было забаронена пасля публікацыі ў ім артыкула І. Лялевеля, які на той час быў палітычным эмігрантам. Аднак А. Г. Кіркор працягнуў выдавецка-асветніцкую дзейнасць і ў 1859 г. заснаваў уласную друкарню, у якой было выдадзена шмат навуковых і мастацкіх кніг.

З 1 студзеня 1860 г. А. Г. Кіркор арандаваў газету «Віленскі веснік» («Kurier Wileński» / «Виленский вестник») і стаў яе выдаўцом і рэдактарам. Пры ім да 19 сакавіка 1864 г. афіцыйная частка газеты была двухмоўнай: указы, распараджэнні ўрада і мясцовых улад і іншыя дакументы друкаваліся адначасова на рускай і польскай мовах, а неафіцыйныя матэрыялы (перадавыя артыкулы, палітычныя агляды, карэспандэнцыі, фельетоны) – на рускай ці на польскай мове. Акрамя таго, А. Г. Кіркор прыцягнуў да супрацоўніцтва лепшых літаратараў краю, якія жылі ў Вільні і за яе межамі, членаў Віленскай археалагічнай камісіі і іншых вядомых вучоных і пісьменнікаў. У газеце «Віленскі веснік» друкаваліся матэрыялы вядомых рускіх журналістаў і літаратараў (В. Вяслоўскі, М. Гусеў, П. Кукальнік). Так, напрыклад, з 1 студзеня па 1 красавіка 1860 г. у выданні публікаваўся цікавы і змястоўны нарыс П. Кукальніка «Путешествие по Замковой улице в Вильне». Дзякуючы такой рэдакцыйнай палітыцы газета «Віленскі веснік» хутка набыла папулярнасць, дасягнула вялікай па тых часах чытацкай аўдыторыі (на яе былі падпісаны каля 3 тыс. чалавек) і стала цэнтрам інтэлектуальнага жыцця Вільні і краю.

[2]Віленская археалагічная камісія // Энцыкл. гіст. Беларусі : у 6 т. Т. 2: Беліцк – Гімн / пад рэд. Б. І. Сачанкі і інш. Мінск : БелЭн, 1994. С. 278.

Пасля паражэння паўстання 1863 г. сітуацыя змянілася. Палітычна-эканамічнае становішча Беларусі значна пагоршылася. У апошняй чвэрці XIX ст. гэта былі найменш індустрыяльна развітыя землі з усіх рэгіёнаў, далучаных да Расійскай імперыі пасля падзелу Рэчы Паспалітай. Па распараджэнні М. Мураўёва з 21 сакавіка 1864 г. газета «Віленскі веснік» пачала выходзіць толькі на рускай мове. У выніку цэнзурных абмежаванняў змяніўся змест выдання, зменшылася яго патэнцыяльная аўдыторыя. У 1865 г. А. Г. Кіркор адмовіўся ад пасады рэдактара, пакінуў Вільню і накіраваўся ў Санкт-Пецярбург, дзе пры падтрымцы аднадумцаў-землякоў М. Вольфа, М. Юматава і ў супрацоўніцтве з імі ў 1868 г. заснаваў газету «Новое время», рэдактарам якой заставаўся да 1871 г. Паводле задумы А. Г. Кіркора, выданне, што стала пазней адной з найбуйнейшых газет у Расійскай імперыі, павінна было быць органам расійска-польскага збліжэння, таму значная ўвага надавалася асвятленню жыцця Паўночна-Заходняга краю, публікацыі матэрыялаў пра гісторыю Беларусі, аналізу канфесійных праблем, вострых пытанняў міжнацыянальных зносін, акрэсленню шляхоў развіцця народнай адукацыі [4].

Аднак, калі ў 1871 г. газету ўзначаліў М. Устралаў, выданне кардынальна змяніла сваю ідэалагічную пазіцыю. У гэты перыяд друкарня, перанесеная з Вільні ў Санкт-Пецярбург, збанкрутавала і была ліквідавана. Неўзабаве А. Г. Кіркор, які практычна не меў сродкаў да існавання, пераехаў у Кракаў, прычым пастанова Пецярбургскага гандлёвага суда забараняла яму вяртацца ў Расійскую імперыю. У дадатак кракаўская навуковая і культурная грамадскасць асуджала яго за супрацоўніцтва з расійскімі ўладамі. Нягледзячы на гэта, А. Г. Кіркор вырашыў стварыць новы часопіс. Канцэпцыю гэтага выдання ён абгрунтаваў у лісце да Ю. Крашэўскага, з якім меў даўняе і трывалае сяброўства і перапісваўся на працягу 1845–1881 гг.: «Неабходна сур'ёзнае, удумлівае, разумнае выданне, якое б, адкінуўшы ўсялякі бруд, разлад і сваркі, спакойна, разважліва і даступна вучыла думаць, разважаць, даследаваць. Толькі такі часопіс можа дапамагчы часу з яго агульным прагрэсам. <…> Сабраць усю польскую інтэлігенцыю, якая захоча зразумець галоўныя мэты, даць зрэз грамадскага жыцця ўсяго свету і аб'яднаць усе правінцыі – хоць бы ў межах расійскай цэнзуры – я лічу неабходнасцю, якую дыктуюць цяперашні момант і месца» (пераклад наш. – *Г. Т.*) (цыт. па [5, s. 3]).

У кантэксце тагачаснай кракаўскай перыёдыкі ідэя стварэння незалежнага навукова-папулярнага часопіса была зразумелай: бракавала сур'ёзных часопісаў навукова-папулярнага характару, што набіралі за мяжой усё большую папулярнасць. На тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай, бадай, толькі выданне «Польскі агляд» («Przegląd polski») магло канкурыраваць з часопісам А. Г. Кіркора. Пераважная ж большасць тагачасных польскамоўных часопісаў (вузкапрафесійныя, жаночыя альбо сатырычна-забаўляльныя выданні) былі арыентаваны на абмежаваную аўдыторыю. Такім чынам, штомесячны часопіс А. Г. Кіркора павінен быў заняць свабодную нішу і стаць альтэрнатывай выданню «Польскі агляд». Разумеючы, што Галіцыя не з'яўляецца дастаткова прыбытковым выдавецкім рынкам, які дазволіць утрымліваць новае выданне і даць сродкі для жыцця, А. Г. Кіркор шукаў адрасатаў на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю. Досвед яго дзейнасці ў Вільні да 1863 г. паказваў, што такі рынак існуе ў Літве, Беларусі і Украіне.

У кастрычніку 1871 г. А. Г. Кіркор выехаў у Познань, дзе было прынята рашэнне аб выданні альманаха. Такі фармат, верагодна, быў выбраны ў асноўным з-за расійскай цэнзуры, паколькі дазвол на распаўсюджванне неперыядычнай друкаванай прадукцыі ў Расійскай імперыі было лягчэй атрымаць. У той жа час адсутнасць фінансавых сродкаў не дазваляла выдаваць штомесячнік, а фармат альманаха не абавязваў працягваць публікацыю матэрыялаў, не навязваў ніякіх тэрмінаў, пры гэтым у выпадку поспеху зборнік мог быць пераўтвораны ў перыядычнае выданне. Гэты фармат А. Г. Кіркор паспяхова выкарыстаў у Вільні, друкуючы шасцітомнік «Віленскі партфель».

Падрабязны праспект будучага выдання, якое атрымала назву «На сёння» («Na dziś») (першапачаткова яно павінна было называцца «Праца»), А. Г Кіркор адаслаў Ю. Крашэўскаму 27 кастрычніка 1871 г. У лісце змяшчаўся план першага тома альманаха, у які пазней былі ўнесены нязначныя змены. У выданне павінны былі ўваходзіць раманы Ю. Крашэўскага і Ф. Шпільхагена, шматлікія паэтычныя творы, артыкулы К. Лібельта, Г. Рашкоўскага, В. Поля, літаратурныя лісты, а таксама сацыяльныя, эканамічныя і мастацкія агляды. Першы том альманаха быў выдадзены ў студзені 1872 г. [6] і змяшчаў спіс з 61 прозвішчам людзей, якія так ці інакш супрацоўнічалі з выданнем, а некаторыя з іх надрукавалі ў ім свае артыкулы. У гэтым спісе А. Г. Кіркор быў пазначаны псеўданімам Ян са Слівіна. Апрача такіх вядомых людзей, як Ю. Крашэўскі, К. Лібельт, Ю. Крэмер, Ю. Майер і А. Бялоўскі, у альманаху надрукавалі свае творы маладыя людзі, якія толькі пачыналі навуковую кар'еру. Сярод іх былі, напрыклад, Э. Гадлеўскі (старэйшы), пазней знакаміты фізіёлаг раслін, і Л. Маліноўскі, будучы выдатны дыялектолаг і славіст. Прафесійная дзейнасць паплечнікаў А. Г. Кіркора з'яўлялася надзвычай шырокай (гісторыкі, юрысты, філолагі, лекары, біёлагі і публіцысты), ён забяспечыў сябе спецыялістамі амаль ва ўсіх галінах тагачаснай навукі. У першым томе альманаха былі апублікаваны таксама некаторыя матэрыялы, якія засталіся ў А. Г. Кіркора пасля рэдагавання зборніка «Віленскі партфель», найперш фрагменты дзённікаў вядомага ўрача Ю. Франка пад

рэдакцыяй і з каментарыямі яго памочніка, доктара М. Гамаліцкага. Успаміны Ю. Франка друкаваліся ва ўсіх тамах альманаха і сталі цікавым унёскам у культурнае і музычнае жыццё Вільні пачатку XIX ст.

Раздзел паэзіі быў прадстаўлены толькі творамі А. Э. Адынца, Ю. Траццяка, К. Бжазоўскага і К. Свідзінскага. Найбольш слабым аказаўся раздзел прозы (Ю. Крашэўскі, нягледзячы на свае ранейшыя абяцанні, не даслаў матэрыял для публікацыі), які змяшчаў толькі перакладны раман нямецкага пісьменнніка і журналіста Ф. Шпільхагена, што не меў ніякай агалоскі. Раздзел філасофіі быў прадстаўлены артыкулам Б. Ф. Трэнтоўскага пра Г. В. Ф. Гегеля і Ю. Крэмера, аднак стыль аўтара стаў падставай для кпінаў шматлікіх рэцэнзентаў, якія называлі публікацыю археалагічным помнікам. У сваю чаргу, раздзел этнаграфіі змяшчаў лісты з этнаграфічнага падарожжа Л. Маліноўскага на Шлёнск, які ў 1869 г., збіраючы матэрыялы для доктарскай дысертацыі, тры месяцы правёў у Сілезіі, каб даследаваць дыялекты гэтага рэгіёна. Разлічаныя на кругагляд тагачаснай чытацкай аўдыторыі, лісты Л. Маліноўскага не былі перагружаны навуковымі тэрмінамі і ўяўлялі сабой хутчэй публіцыстычны рэпартаж пра падарожжа, аповед пра прыгоды ў пошуках слядоў польскасці на тэрыторыі забытай правінцыі. Найбольшую каштоўнасць гэтай публікацыі складае аб’ектыўнае адлюстраванне нацыянальных і эканамічных праблем, што існуюць у Сілезіі, сродкамі маляўнічай мовы. Матэрыял К. Ліске «Арлеанская Багародзіца» (пачатак цыкла «Гістарычныя жанчыны», 2-я і 3-я часткі якога публікаваліся ў наступных тамах альманаха) з’яўляецца грунтоўным даследаваннем, прысвечаным Жанне д’Арк, у якім у даступнай і папулярнай форме распавядаецца пра гісторыю Францыі XV ст., яе палітычнае становішча. Жанна д’Арк прадстаўлена як простая дзяўчына, далёкая ад дэманізаванай святасці, якая, баючыся пакутаў, адмовілася ад сваіх поглядаў, хаця разумела непазбежнасць смерці па палітычных прычынах. Варта адзначыць, што рэцэнзент гэтай публікацыі, вядомы тагачасны польскі гісторык А. Павінскі, які выступіў пад псеўданімам Януры Конха, абвінаваціў К. Ліске ў плагіяце [4]. У раздзеле палітычнай эканоміі быў апублікаваны цікавы артыкул маладога дацэнта Ягелонскага ўніверсітэта Г. Рашкоўскага.

Завяршэннем выдавецка-асветніцкай дзейнасці А. Г. Кіркора стала публікацыя двух тамоў альманаха «Кракаўскі партфель» («Teka Krakowska») (1884).

## Заключэнне

Гісторыя журналістыкі непарыўна звязана з гісторыяй грамадства і дынамікай сацыякультурнай рэальнасці адпаведнага перыяду. Гепалітычныя змены, трансфармацыя сацыяльных і каштоўнасных дамінант уплываюць на змест, ідэалагічную накіраванасць і жанрава-тэматычную напоўненасць перыядычных выданняў. Так, XIX стагоддзе, пазначанае шматлікімі грамадска-палітычнымі пераўтварэннямі і рэвалюцыйнымі зменамі мастацка-эстэтычных парадыгм (распаўсюджванне асветніцкіх тэндэнцый, арыентацыя на навукова-тэхнічны прагрэс, адначасовае шанаванне нацыянальных культурных традыцый і ўключэнне ў агульначалавечы духоўны кантэкст), вызначыла функцыянальныя і эстэтычныя параметры тагачаснай прэсы. Рамантызм, як літаратурная, мастацкая і інтэлектуальная плынь еўрапейскай культуры, якая на ўсходнеславянскіх землях актуалізавалася ў першай трэці XIX ст. дзякуючы эстэтычным здабыткам А. Міцкевіча, паўплываў на дзейнасць навуковай і грамадскай эліты Беларусі.

У гэтым кантэксце асабістыя якасці, адміністрацыйныя і вытворчыя навыкі І. Лялевеля і А. Г. Кіркора ў поўнай меры адпавядалі запатрабаванням аўдыторыі. Іх журналісцкая і выдавецкая дзейнасць (навукова-папулярныя выданні «Віленскі веснік», «Віленскі партфель», «На сёння») стала грунтоўным падмуркам для станаўлення беларускай навукова-папулярнай прэсы XX ст. Жанрава-тэматычная разнастайнасць і выразная практычная накіраванасць гэтых выданняў, а таксама здольнасць І. Лялевеля і А. Г. Кіркора вызначыць патэнцыяльны сегмент аўдыторыі – гэта не толькі цікавая старонка гістарычнай спадчыны, але і каштоўны прыклад яднання рамантычных ідэалаў духоўнай свабоды чалавека і асветніцкага культу ведаў, увасоблены ў сферы масавых камунікацый.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Ущиповский СН. *Русская историческая периодика 1861–1917 гг.* Санкт-Петербург: Роза мира; 2008. 195 с.
2. Syrokomla W. Mińsk. W: Jan ze Śliwina, edytor. *Teka Wileńska. Numer 1.* Wilno: Teofil Glüeksberg; 1857. s. 173–233.
3. Syrokomla W. Mińsk. W: Jan ze Śliwina, edytor. *Teka Wileńska. Numer 2.* Wilno: Teofil Glüeksberg; 1857. s. 133–205.
4. Дарашчонак ПЛ. Газета А. Кіркора і М. Юматава «Новое время» (Санкт-Пецярбург, 1868–1871 гг.) аб праблемах і перспектывах культурна-нацыянальнага развіцця Паўночна-Заходняга краю. У: Дубовік СВ, рэдактар. *Журналістыка – 2017: стан, праблемы і перспектывы. Матэрыялы XIX Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі; 16–17 лістапада 2017 г.; Мінск, Беларусь.* Мінск: БДУ; 2017. с. 309–313.
5. Stolzman M. Z działalności wydawniczej Adama Honorego Kirkora. Pismo zbiorowe «Na dziś». W: Polska akademia nauk. *Rocznik historii czasopiśmiennictwa polskiego. Tom VII.* Wroclaw: Zakład Narodowy im. Ossolińskich; 1968. s. 73–102.

6. Jan ze Śliwina, edytor. *Na dziś. Pismo zbiorowe. Poświęcone literaturze, naukom, sztuce, gospodarstwu krajowemu, handlowi i przemysłowi. Tom 1*. Krakow: Jan Waligurski; 1872. 446 s.
7. Koncha J. Jan ze Śliwina, edytor. Na dziś. Pismo zbiorowe. Poświęcone literaturze, naukom, sztuce, gospodarstwu krajowemu, handlowi i przemysłowi. Tom 1 [recenzja]. W: Jozef Ungra, edytor. *Tygodnik ilustrowany. Tom VII. Serya druga.* Warszawa: Gebethner i Wolff; 1872. s. 44–45.

## References

1. Ushchipovskii SN. *Russkaya istoricheskaya periodika 1861–1917 gg.* [Russian historical periodicals 1861–1917]. Saint Petersburg: Roza mira; 2008. 195 p. Russian.
2. Syrokomla W. Mińsk. W: Jan ze Śliwina, edytor. *Teka Wileńska. Numer 1*. Wilno: Teofil Glüeksberg; 1857. s. 173–233.
3. Syrokomla W. Mińsk. W: Jan ze Śliwina, edytor. *Teka Wileńska. Numer 2*. Wilno: Teofil Glüeksberg; 1857. s. 133–205.
4. Darashchonak PL. [Newspaper of A. Kirkor and M. Yumatov «New Time» (Saint Petersburg, 1868–1871) about the problems and prospects of the cultural and national development of the North-West region]. In: Dubovik SV, editor. *Zhurnalistyka – 2017: stan, prablemy i perspektyvy. Matjeryjaly XIX Mizhnarodnaj navukova-praktychnaj kanferjencyi; 16–17 listapada 2017 g.; Minsk, Belarus’* [Journalism – 2017: state, problems and prospects. Proceedings of the 19th International scientific and practical conference; 2017 November 16–17; Minsk, Belarus]. Minsk: Belarusian State University; 2017. p. 309–313. Belarusian.
5. Stolzman M. Z działalności wydawniczej Adama Honorego Kirkora. Pismo zbiorowe «Na dziś». W: Polska akademia nauk. *Rocznik historii czasopiśmiennictwa polskiego. Tom VII*. Wroclaw: Zakład Narodowy im. Ossolińskich; 1968. s. 73–102.
6. Jan ze Śliwina, edytor. *Na dziś. Pismo zbiorowe. Poświęcone literaturze, naukom, sztuce, gospodarstwu krajowemu, handlowi i przemysłowi. Tom 1*. Krakow: Jan Waligurski; 1872. 446 s.
7. Koncha J. Jan ze Śliwina, edytor. Na dziś. Pismo zbiorowe. Poświęcone literaturze, naukom, sztuce, gospodarstwu krajowemu, handlowi i przemysłowi. Tom 1 [recenzja]. W: Jozef Ungra, edytor. *Tygodnik ilustrowany. Tom VII. Serya druga.* Warszawa: Gebethner i Wolff; 1872. s. 44–45.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 28.11.2022.*
*Received by editorial board 28.11.2022.*